# ЧАС ДЫПЛАМАТЫІ

## Прэзідэнт прыняў даверчыя лісты паслоў 9 краін

**Учора ў Палац Незалежнасці прыбылі афіцыйныя прадстаўнікі Беніна, Бразіліі, Даніі, Іспаніі, Емена, Рэспублікі Карэя, Мальты, Славеніі і Уганды, каб перадаць кіраўніку дзяржавы дыпламатычныя дакументы, якія ўручаюцца замежным паслом пры першым прадстаўленні і сведчаць яго прызначэнне.**

### Без дыскрымінацыі і канфліктаў

Прэзідэнт перакананы, што на беларускай зямлі паслы будуць адчуваць сябе ўпэўнена і ў бяспецы. «Мы па праве ганарымся тым, што ў нас няма расавай дыскрымінацыі, адсутнічаюць разлады і канфлікты на нацыянальнай, рэлігійнай падставе», — дадаў ён.

Беларускі лідар выказаў упэўненасць, што паслам будзе камфортна ажыццяўляць дыпламатычныя функцыі, паколькі асновы нашай знешняй палітыкі — міралюбнасць, шматвектарнасць, узважанасць, паслядоўнасць і прадказальнасць.

І тыя, хто падзяляе гэтыя падыходы, хто прыходзіць да нас з мірам і добрымі намерамі, заўсёды знойдуць у Беларусі разуменне і падтрымку ў рэалізацыі ўсіх канструктыўных планаў і ідэй, рэзюмаваў ён.

На думку кіраўніка дзяржавы, сёння надзвычай запатрабавана канструктыўная роля дыпламатыі і дыпламатаў, якія ўменнем слухаць і чуць, весці перамовы і знаходзіць кампрамісы дапамагаюць пераадолець складанасці і рознагалоссі ў міжнародных адносінах.

«У сучасным свеце, які раздзіраецца супярэчнасцямі, няспыннымі ваеннымі канфліктамі, гандлёвымі войнамі і санкцыямі, экстрэмізмам і нецярпімасцю, іншымі беспрэцэдэнтнымі выклікамі і пагрозамі, Беларусь мэтанакіравана і паслядоўна прасоўвае мірны і ўсёабдымны парадак дня», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што наша краіна шчыра нацэлена на абнаўленне дыялогу па ўмацаванні мер бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўраатлантыцы і Еўразіі. Акрамя таго, мы нацэлены на стварэнне дзейсных механізмаў партнёрства паміж рознымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі, фарміраванне спрыяльнага клімату для гандлёвага, эканамічнага і інвестыцыйнага ўзаемадзеяння.

Кіраўнік дзяржавы выказаў надзею на падтрымку з боку дзяржаў прысутных паслоў па гэтых і іншых тэмах узаемнага інтарэсу.

### Рэзервы супрацоўніцтва

Па словах беларускага лідара, мы вельмі шануем адносіны з кожнай з дзяржаў, чые прадстаўнікі ўчора знаходзіліся ў Палацы Незалежнасці.

Паводле яго слоў, Данія — перспектыўны партнёр для Беларусі, з якім мы маем намер развіваць больш прадуктыўнае супрацоўніцтва. Агульная для нашых краін задача — падтрымка міру і стабільнасці ў Еўрапейскім рэгіёне. Беларусі важны дыялог з дацкім бокам па гэтым і іншых пытаннях двухбаковага парадку дня, а таксама развіццё кантактаў у галіне гандлю, інвестыцый і энергаэфектыўнасці.

Наша краіна таксама надае вялікае значэнне ўмацаванню супрацоўніцтва з Іспаніяй. «Гэта пацвярджае прызначэнне ў лютым гэтага года першага пасла Беларусі ў Мадрыдзе», — нагадаў Прэзідэнт і выказаў упэўненасць, што аналагічныя крокі з іспанскага боку па адкрыцці паўнавартаснага дыпламатычнага прадстаўніцтва ў Мінску ўмацавалі б адносіны паміж нашымі краінамі.

«Мы здольныя прыкметна прасунуцца ў нашым узаемадзеянні з Мальтай, якая, з'яўляючыся адносна невялікай па тэрыторыі, колькасці насельніцтва дзяржавай, выконвае вельмі важную ролю ў Еўрапейскім саюзе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта, за апошнія гады нашай краіне ўдалося стварыць салідную базу для развіцця і пашырэння ўзаемнага супрацоўніцтва, сувязяў са Славеніяй, якая неаднаразова на справе даказвала, што з'яўляецца вялікім сябрам Беларусі. «Мы ўдзячныя вашай краіне за падтрымку нашага імкнення да нармалізацыі адносін з Еўрасаюзам. Стабільна інтэнсіўны і эфектыўны характар носяць кантакты беларускіх і славенскіх бізнесменаў. Нашы дзелавыя колы гатовыя да новых сумесных праектаў у энергетыцы, фармацэўтыцы, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве і іншых сферах», — дадаў ён.

«Адным з прыярытэтаў Беларусі ў Лацінаамерыканскім рэгіёне застаецца развіццё супрацоўніцтва з Бразіліяй. У фокусе двухбаковых адносін — умацаванне палітычнага дыялогу, нарошчванне тавараабароту, стварэнне сумесных вытворчасцяў, — сказаў Прэзідэнт. — Разлічваем, што праца пасла будзе садзейнічаць выхаду беларуска-бразільскіх адносін на якасна новы ўзровень, які адпавядае патэнцыялу нашых краін».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што Емен традыцыйна ўваходзіў у лік асноўных партнёраў Беларусі ў арабскім свеце. Ён са шкадаваннем адзначыў, што кантакты паміж нашымі краінамі былі замарожаныя з прычыны рэзкага пагаршэння ваенна-палітычнай сітуацыі ў Емене. «У справе хутчэйшага аднаўлення краіны, вяртання яе да мірнага рытму жыцця Беларусь гатова дапамагаць, забяспечыўшы пастаўкі ўсяго таго, што выпрабляецца ў нашай краіне», — дадаў беларускі лідар.

Беларусь адкрыта для далейшага паглыблення ўзаемавыгадных сувязяў з Рэспублікай Карэя, асабліва ў інавацыйных сферах. Аляксандр Лукашэнка запрасіў карэйскіх інвестараў для рэалізацыі высокатэхналагічных рашэнняў у Беларусі і ўмацавання супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і турызму.

«У рэгіёне Заходняй Афрыкі разглядаем Бенін у якасці перспектыўнага гандлёва-эканамічнага партнёра. Інтарэсам нашых краін адпавядае больш інтэнсіўнае развіццё супрацоўніцтва і забеспячэнне стабільнага росту эканомікі», — сказаў ён.

Беларусь гатовая прапанаваць Беніну шырокую гаму тэхнікі, спажывецкіх тавараў і харчавання, адукацыйныя паслугі. Прэзідэнт дадаў, што мы чакаем ад бенінскага боку сустрэчных ініцыятыў для сумеснай рэалізацыі.

«Пацвярджаем нашу цікавасць да развіцця ўзаемадзеяння з Угандай. Бачым перспектывы ў наладжванні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, у першую чаргу ў галіне паставак беларускай складанатэхнічнай прадукцыі, якая добра зарэкамендавала сябе на афрыканскім рынку, а таксама стварэння сумесных вытворчасцяў у вашай краіне», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, Беларусь разлічвае на садзейнічанне новага пасла ў рэалізацыі праектаў у іншых сферах узаемнай цікавасці, у прыватнасці па падрыхтоўцы ў Беларусі кваліфікаваных кадраў для Уганды, супрацоўніцтве ў галіне сельскай гаспадаркі, аховы здароўя, абароны, культуры.

«Разлічваем, што пры вашым актыўным і прафесійным удзеле гэта супрацоўніцтва будзе мацнець і дынамічна развівацца, напаўняцца новымі якасцю і зместам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

---

Партнёры

# НОВЫ ЭТАП У ГІСТОРЫІ

## Аляксандр Лукашэнка 29 мая прыме ўдзел у саміце ЕАЭС у Нур-Султане

**А ў другой палове года Прэзідэнта чакаюць у Казахстане з афіцыйным візітам. Аб гэтым падчас размовы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры заявіў Ермухамет Ертысбаеў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Казахстана ў Беларусі. Мерапрыемства было прысвечана пазачарговым выбарам Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан, якія адбудуцца 9 чэрвеня гэтага года.**

Адстаўка 19 сакавіка 2019 года першага кіраўніка краіны Нурсултана Назарбаева стала выключнай падзеяй не толькі для сусветнай супольнасці, але і для палітычных дзеячаў Казахстана. Першы прэзідэнт Казахстана вызначыў і свайго пераемніка Касыма-Жамарта Такаева. Сімвалічна, што яго апошні да назначэння афіцыйны візіт на пасадзе старшыні сената быў у Беларусь, дзе ён сустракаўся з нашым Прэзідэнтам і парламентарыямі.

«Трэба зняць любую нявызначанасць», — з такім пасылам прэзідэнт Такаеў аб'явіў будучыя выбары. Чарговае галасаванне павінна было адбыцца ў красавіку 2020 года, але палітычныя эліты разумелі, што з меркаваннеў легітымнасці і народнай падтрымкі кіраўніка дзяржавы патрэбна ранейшая электаральная кампанія. «Прычым выбары павінны быць канкурэнтнымі, справядлівымі, свабоднымі і альтэрнатыўнымі», — пракаментаваў пасол.

Касым-Жамарт Такаеў настроены на захаванне пераемнасці стратэгічнага курсу Нурсултана Назарбаева. «А стратэгічны курс Нурсултана Абішавіча быў такі — увайсці ў сярэдзіне стагоддзя ў 30 самых развітых краін свету», — адзначыў пасол Казахстана і дадаў, што не сумняваецца ў перамозе дзеючага кіраўніка дзяржавы.

У якасці кандыдатаў на найвышэйшую дзяржаўную пасаду зарэгістраваныя сем чалавек. Сур'ёзным гульцом кампаніі, на думку пасла, з'яўляецца Аміржан Касанаў, кіраўнік апазіцыйнай партыі «Лёс нацыі». Упершыню ў гісторыі краіны балатуецца на прэзідэнцтва жанчына — Данія Еспаева ад партыі «Светлы шлях».

«Прэзідэнцкая выбарчая кампанія, якая цяпер праходзіць у Казахстане, толькі на першы погляд можа здацца вельмі простай для ўлады», — сказаў Ермухамет Ертысбаеў.

Адказваючы на пытанне журналістаў наконт змены курсу еўразійскага супрацоўніцтва будучым прэзідэнтам, пасол адзначыў, што ў Казахстане не было, няма і не будзе альтэрнатывы еўразійскай інтэграцыі: «Мы ішлі і будзем ісці па гэтым шляху. Мы будзем пашыраць, выводзіць на новы якасны ўзровень Еўразійскі эканамічны саюз. Ён будзе прывабным не толькі для былых рэспублік Савецкага Саюза. Я ўпэўнены, што XXI стагоддзе — стагоддзе інтэграцыі». Пры гэтым захаваецца становчая дынаміка і двухбаковых адносін Беларусі і Казахстана, тавараабарот паміж якімі ўжо дасягнуў амаль мільярда долараў.

Сачыць за выбарамі ў Казахстане будуць звыш 700 назіральнікаў, з іх 350 ад АБСЕ. 9 чэрвеня выбарчы ўчастак з 7.00 да 20.00 будзе працаваць у пасольстве ў Мінску. Пасля галасавання ЦВК Казахстана мае сем дзён для вызначэння, апублікавання і рэгістрацыі выбранага прэзідэнта.

**Марыя ДАДАЛКА.**

---

Парламенцкі дзённік

# ІДЭІ ШУКАЮЦЬ ПАДТРЫМКУ

**20 мая старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка прыняў удзел у пасяджэнні Савета Парламенцкай Асамблеі АДКБ у Бішкеку (Кыргызская Рэспубліка), паведамляе прэс-служба ніжняй палаты беларускага парламента.**

У пасяджэнні ўдзельнічалі дэлегацыі Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана. У якасці назіральнікаў прысутнічалі прадстаўнікі Сербіі.

Удзельнікі мерапрыемства абмеркавалі прыярытэты старшынства Кыргызскай Рэспублікі ў АДКБ у 2019 годзе, вынікі дзейнасці Пастаяннага савета АДКБ па ўдасканаленні інстытуцыйных асноў Арганізацыі, актуальныя пытанні процідзеяння выклікам і пагрозам калектыўнай бяспекі, гарманізацыі нацыянальнага заканадаўства дзяржаў — членаў АДКБ на 2016 — 2020 гады, узаемадзеяння парламенцкіх дэлегацый краін АДКБ у Парламенцкай асамблеі АБСЕ, арганізацыю працы групы міжнародных назіральнікаў ПА АДКБ па назіранні за пазачарговымі выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан. Акрамя таго, быў удакладнены план работы ПА АДКБ на 2019 год.

Уладзімір Андрэйчанка праінфармаваў удзельнікаў пасяджэння аб выніках Міжнароднай канферэнцыі Групы падтрымкі Шаўковага шляху ПА АБСЕ «Адзін пояс, адзін шлях: паглыбленне супрацоўніцтва ў імя ўстойлівага развіцця і росквіту», якое адбылося 29—30 красавіка ў Мінску.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама расказаў аб асноўных выніках дзейнасці беларускай парламенцкай дэлегацыі ў ПА АБСЕ. У прыватнасці, ён адзначыў, што па ініцыятыве беларускага боку пры актыўнай падтрымцы дзяржаў — членаў АДКБ Парламенцкай асамблеяй АБСЕ былі прыняты шэраг рэзалюцый па такіх важных пытаннях, як супрацоўніцтва ў пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, барацьба з гандлем людзьмі і распаўсюджваннем наркотыкаў, прасоўванне зялёнай і лічбавай эканомікі ў інтарэсах забеспячэння эканамічнага росту на прасторы АБСЕ.

Уладзімір Андрэйчанка таксама паведаміў пра праект чарговай беларускай рэзалюцыі «Стратэгічнае прагназаванне ў галінах навукі, тэхналогій і інавацый для ўстойлівага развіцця», якая падрыхтавана да летняй сесіі ПА АБСЕ. Зараз праект праходзіць працэдуру збору подпісаў для ўнясення ў якасці дадатковага пункта ў парадак дня сесіі Арганізацыі, якая адбудзецца ў ліпені 2019 года ў Люксембургу. Беларускі парламентарый выказаў надзею на цеснае супрацоўніцтва калег з краін АДКБ у прыняцці рэзалюцыі.

Прапановы беларускага боку былі аднагалосна падтрыманы ўдзельнікамі пасяджэння.

* * *

Напярэдадні, 19 мая, Уладзімір Андрэйчанка правёў у Бішкеку двухбаковыя сустрэчы са сваімі кыргызскім і казахскім калегамі. Падчас сустрэчы са спікерам парламента Кыргызскай Рэспублікі Дастанбекам Джумабекавым старшыня Палаты прадстаўнікоў прапанаваў надаць больш сур'ёзную ўвагу развіццю ўзаемадзеяння ў сферах адукацыі, медыцыны і па іншых кірунках, не менш цікавых за гандлёва-эканамічны. Датычна эканомікі кіраўнік ніжняй палаты беларускага парламента адзначыў важнасць пашырэння не толькі гандлю, але і вытворчай кааперацыі з мэтай выхаду на рынкі трэціх краін, перш за ўсё ўдзельніц ЕАЭС.

У ходзе сустрэчы са старшынёй Мажыліса (ніжняй палаты) парламента Рэспублікі Казахстан Нурланам Нігматуліным былі адзначаны інтэнсіўны дыялог, цесныя і даверныя адносіны, якія развіваюцца паміж дзвюма дзяржавамі і іх парламентамі. Удзельнікі сустрэчы падкрэслілі, што асаблівая заслуга ў дасягненні высокага ўзроўню двухбаковага супрацоўніцтва належыць прэзідэнтам дзвюх дзяржаў.

Па выніках сустрэчы Нурлан Нігматулін выказаў упэўненасць у тым, што пастаўленая прэзідэнтамі дзвюх краін задача выхаду на тавараабарот у адзін мільярд долараў цалкам выканальная. Паводле яго слоў, парламент Казахстана будзе аказваць усё неабходнае садзейнічанне вырашэнню гэтай і іншых актуальных задач развіцця двухбаковага супрацоўніцтва з брацкай Беларуссю.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**